ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 85 (1354) | ПАНЯДЗЕЛАК, 13-га красавіка 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 "
6 месяцаў	1 р. 80 "
1 год	3 р. 60 "

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. №: 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Інформацыйнае паведамленьне

10-12 красавіка 1931 г. адбыўся чарговы плēнум Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б. Плēнум разгледзеў пытаньні:

1. Аб праверцы ходу падрыхтоўкі да вясновай пасеўнай кампаніі.
2. Даклад т. Калініна аб пастанове ЦБК УсеКП(б).

Пастановы, прынятыя плēнумам па гэтых пытаньнях, будуць апублікаваны ў друку.

Плēнум пастанавіў кооптаваць у склад плēнуму т. т. Рэдэнса, Горына і Турлая. Адначасова плēнум выбраў т. Радэнса ў склад бюро ЦБ КП(б)Б. Плēнум пастанавіў вывесьці са складу ЦК т. Ульянава.

Тэхніка ў пэрыяд рэконструкцыі рашае ўсё (СТАЛІН)

ЗМАГАЦЦА ЗА ТЭХНІКУ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ

„Чырвоная Зьмена" разгарнула праверку, як змагаецца комсамол Віцебску за тэхніку, за выкананьне узятых абавязкаў

У адказ на прамову т. Сталіна комсамол Беларусі ўключыўся ў разгорнуты ўсесаюзны паход за тэхніку. Рад організацый выпрацаваў конкрэтны плян дзейнасьці і прыступіў да яго ажыцьцяўленьня, да рэалізацыі ўзятых абавязкаў.

Барацьба за аўладаньне тэхнікай павінна праходзіць пад кутом погляду змаганьня за выкананьне прамфінпляну, за рацыяналізацыю вытворчасьці і зьніжэньне сабекошту продукцыі. Барацьба за тэхніку павінна быць самым найцясьнейшым чынам ўвязана з барацьбой за выкананьне кантрольных лічбаў 3-га, рашаючага году 5-ці годкі.

Комсамол Віцебску, таксама, як і Менскі і Барысаўскі комсамол, ўключыўся ў паход за тэхніку, Віцебская комсамолія выпрацавала плян конкрэтных дзеяньняў па барацьбе за аўладаньне тэхнікай, і зараз „Чырвоная Зьмена" разам з ўсёй комсамольскай організацыяй, пачала самаправерку ўзятых абавязкаў.

Самаправерка па Віцебску павінна праверыць наколькі Віцебская організацыя здолела праламіць лёзунг Сталіна ў штодзённым жыцьці, наколькі гэты лёзунг стаў асновай для організацыі барацьбы за тэхніку за 45, 518 і 1040.

Адначасова з гэтым, комсамольская організацыя астатніх раёнаў павінна разгарнуць самастойную праверку узятых на сябе абавязкаў з тым, каб да другой гадавіны соцспаборніцтва прыйсьці з вялікім багажом свайй барацьбы за тэмпы плюс тэхніку, плюс якасьць.

Пачалася праверка выкананьня абавязкаў па тэхніцы

Віцебск 11 (Па тэлефону ад нашага спэцкора). Учора па скліканай „Чырвонай Зьменай", сумесна з Віцебскім Гаркомам комсамолу, нарадзе юнкораў, брыгадзіраў, комсамольцаў і мэханікаў Політэхнікуму, абгаворавы плян агляду праверкі Віцебскай організацыі па пытаньню рэалізацыі лёзунгу т. Сталіна і рашэньняў бюро ЦК УсеЛКСМ аб аўладаньні тэхнікай.

На нарадзе організаваны брыгады і накіраваны ў ячэйкі.

Ячэйкі разбіты для агляду на тры групы:

1. Вытворчую—уваходзіць колектыў фабрыкі „Чырвоны мэталісты", акулярнай, „Шлях індустрыялізацыі", Белдзяржбуду, ф-кі імя „Лекерта", ф-кі „Дзьвіна", панчошнай, інструмэнтальнай, гарбарні і колектыву МББ чыгуначнікаў.

2. ФЗВ—уваходзіць: ФЗВ мэталістых, абутнікаў і ф-ка „Дзьвіна",

3. Саўгасы—ўвахолзяць ячэйкі саўгасу „Новы сьвет" і колгасу „Чырвоная армія",

Задача брыгад ня толькі праверыць становішча, але і дабіцца зруху ў рабоце па аўладаньню тэхнікай. Брыгады павінны будуць праводзіць рад масавых мерапрыемстваў, наладзіць юнкораўскія пасты на прадпрыемствах і штодзённа інфармаваць „Чырвоную Зьмену".

Трэба адзначыць, што, па весткам, рэалізацыю лёзунгу Сталіна і рашэньня бюро ЦК УсеЛКСМ рад прадпрыемстваў праводзіць дрэнна.

Пастанова плēнуму Гаркому ЛКСМБ ад 9-га сакавіка г. г., якая была надрукавана у „Ч. З.", рад колектываў і ячэек не прапрацоўваў і не ажыцьцёвіў. Напрыклад, у колектывах ф-кі „Чырвоны мэталісты", акрамя фармальнага абгавареньня рашэньняў ЦК, нічога ня зроблена. На панчошнай ф-цы ня лепш. У колектыве ЦРК думаюць, што аўладаць тэхнікай у іхніх умовах нельга і таму гэтая задача іх не датычыць.

Бюро Гаркому комсамолу заслухала інформацыю аднач. колектываў і знайшло, што яны політычна недаацэньваюць задачы аўладаньня тэхнікай.

Ёсьць факты аказёньваньня, дзякуючы апашленьня гэтага важнага мерапрыемства.

9-га красавіка комсамольскі колектыў Акулярнай фабрыкі наладзіў вечар, прысьвечаны пытаньню аўладаньня тэхнікай. Здавалася-б, што пры адсутнасьці належнай работы ў гэтай галіне, гэты вечар трэ' было-б скарыстаць для яе ўзмацненьня. Але вечар быў не надрыхтаваны. На вечары няпрысутнічала рабочая моладзь.

Дакладчык, прымацаваны да ф-кі студэнт Політэхнікуму, зрабіў агульны даклад, які не мобілізаваў увагу. Выступаўшыя пасьля дакладу нічога конкрэтнага не сказалі аб тым, як выконваюцца пастановы аб аўладаньні тэхнікай у організацыі. Ніхто нават ня спыніўся на тым, што робіцца ў гэтых комсамольскіх колектывах.

Прадстаўнікі парт і профорганізацый не палічылі патрэбным выступіць.

На гэтым і разышліся

Профорганізацыі ня вядуць работы па рэалізацыі задач аўладаньня тэхнікай. Месячнік разгортваньня паходу за тэхніку вызначаны пастановаю ЦСПСБ з першага красавіка па першая мая, яшчэ не распачаты.

Аб гэтым сьведчыць праведзеная 10-га красавіка праверка, у парадку рэалізацыі прапановы „Чырвонай Зьмены" і пастановы ЦК ЛКСМБ, Віцебскай організацыі.

На фабрыках „Профінтэрн" і імя Лекерта нават не прапрацавана прамова Сталіна.

Ёсьць выпадкі, што фабкомы зрываюць заняткі гурткоў па аўладаньню тэхнікай.

Праверка разгорнутая „Чырвонай Зьменай" павінна будзе ўнесьці карэнны пералом у гэту работу.

М. Пузікаў

Справа агента дэфэнзывы-Палянскага

ВАРШАВА, 11.—На вячэрнім пасяджаньні суда, на другі дзень працэсу Палянскага, упяршыню робіцца спроба асьцярожна працягнуць ужо праваліўшуюся з трэскам вэрсію аб „службе Палянскага ў Савецкім пасольстве". Сьведка абароны Лебедзеў расказвае, быццам між іншым, што Палянскі служыў у „дыплёматычнай савецкай місіі, ня то ў Чарнавіцах, ня то ў Люблянах. Другі сьведка, Казаноўскі, якому Палянскі абяцаў даць рэкомэндацыйны ліст ня то профэсару Штэйнаху, ня то Эйнштэйну, паведамляе, што Палянскі расказваў аб сваёй службе ў якасьці „ваеннага атташэ" ў паўпрэдстве СССР" у Вене. „Пасьля прыезду з СССР,—заяўляе сьведка на пытаньне старшыні,—убачыўшы ўласнымі вачыма, што там адбываецца, Палянскі парашыў канчаткава парваць з бальшавікамі і пакляўся адпомсьціць ім". Аднак, ня гледзячы на тое, што гэтыя моманты абвергнуты нотай СССР і лістам Маркуса, старшыня суда ўсё яшчэ на лічыць патрэбным агаласіць савецкую ноту і паказаньні Маркуса, каб раз назаўсёды пакончыць з гнюсяй комэдыяй аб „бальшавіку Палянскім" і перайсьці да сапраўднага расьсьледваньня справы аб замаху на паўпрэдства. Але суд, як відаць, менш за ўсё хоча заняцца гэтым расьсьледваньнем. Засталося дапытаць яшчэ 8 сьведкаў, у тым ліку жонку Палянскага. Сёньнешняе пасяджаньне пакажа, ці намяраецца старшыня ў заключэньне судовага сьледзтва, так сказаць, пад заслону, усё-ж разыграць крапленыя козыр аб „савецкім і комуністычным мінулым" ужо выкрытага р'янага контрразьведчыка Палянскага

Нявідочная, але ўладная рука, якая рэжысуе судовай комэдыяй, адчуваецца ня толькі ў залі суда, але і па-за ёю, у першую чаргу ў друку. Характар заданьня, ускладзенага на суд, ня выклікае ўжо ніякіх сумненьняў. Гэтае заданьне заключаецца ў тым, каб наколькі магчыма выратаваць амаль праваліўшуюся провокацыйную анты-савецкую старану справы і выцягнуць сухім з вады організацыю, якая стаяла за Палянскім. У гэтых адносінах працуюць у дружным контакце суд, прокурор і абарона. Адсюль унікненьне ад усіх пытаньняў, якія датычаць контр-разьведчага мінулага Палянскага і ўсяго таго, што маглоб навесьці на сьляды намоцнікаў падсуднага. Адсюль і апошні ратавальны мосьцік—вэрсія аб вар'ядтве падсуднага, якая на ўвьдзіў аднадушна разьвіваецца ўсім афіцыйным друкам на чале з „Газэтай польскай". Гэтым таксама тлумачыцца імкненьні формальна выгарадзіць Польшчу з усёй гэтай справы, для чаго ўпарта настойваюць што Палянскі ня меў права на польскае падданства і не застанаўліваюцца нават перад абвінавачаньнем Палянскага ў атрыманьні грамадзянства „абманным шляхам".

Пад чырвонымі сьцягамі комсамолу

Ліст з Нямеччыны спэцыяльна для „Чыр. Зьмены"

Агульнанямецкі зьезд моладзі ў велікдзень адбыўся па ўсёй Нямеччыне вельмі бурліва. Першыя даныя яшчэ не даюць поўнага малюнку, але даюць магчымасьць зрабіць некаторыя вынікі аб узрослай актыўнасьці нямецкага комсамолу.

Бэрлін

У Фрыдрыхсфэльдзе, у магілы ахвяр рэволюцыі адбыліся мітынгі. Прысутнічала больш 1000 комсамольцаў. Выступалі дэпутат рэйхстагу, комсамолец Артур Бекер і Фрыц Рэйтар і прывітала комсамолка з Даніі. Ня гледзячы на забарону, у Бэрліне зьехалася больш 2000 комсамольцаў провінцыі. Прысутнічала 15 прадстаўнікоў з-за мяжы: з Англіі, Францыі, Аўстрыі, Чэха-Славакіі, Швэцыі і Даніі. Ня гледзячы на тое, што конгрэс рэволюцыйнага вузла быў забаронены, ён адбыўся.

Прысутнічала звыш 300 дэлегатаў, сярод іх шмат прадстаўнікоў хрысьціянскай моладзі, членаў СД саюзу моладзі і шмат прадстаўнікоў фабрычнай моладзі. У дыскусіі прымалі ўдзел 12 таварышоў, сярод іх прадстаўнікі з фабрык Крупа ў Эсэне, Шыфар у Гамбурзе, Фільм-Вольф у Бітэрфэльдзе, Цэйс у Іене, Кнорбрэмзэ і Шварцкопф у Бэрліне 2 прадстаўніка с-д моладзі, адзін прадстаўнік хрысьціянскай моладзі. Конгрэс бліскуча прайшоў і паказаў баявы настрой працоўнай моладзі Нямеччыны. На зьездзе прынята пастанова аб адозьве да ўсёй працоўнай моладзі Нямеччыны, а таксама склікаць агульна-нямецкі конгрэс рабочай моладзі. Аб конгрэсе і аб яго ходзе будзе выпушчана асобная брашура.

Да нядзелі—увечары, у Бэрліне ва ўсіх частках гораду адбыліся 10 нелегальных дэмонстрацый.

Ў паўночным прыгарадзе у адной толькі дэмонстрацыі прынялі ўдзел больш 1000 рабочых. Прададзена 14000 экз. газэты „Юнге Гардэ", некалькі сот маладых рабочых уступіла ў комсамол.

Рабочыя кварталы ўпрыгожаны чырвонымі сьцягамі. З вялікім трудом паліцыі ўдаецца зьнімаць вывешаныя транспоранты і плякаты.

Усюды адбываюцца масавыя арышты.

Паліцыя барбарскі абыходзілася з дэмонстрантамі. Так, напрыклад, яна ў Трэптаве, Нэйкельне і ў Вэдынгу (прыгараду Бэрліна) сьлепа страляла ў дэмонстрантаў. Ужо ў чацьвер усе шасэйныя шляхі, якія вядуць у Бэрлін, былі окупаваны паліцэйскімі. Усе чыгуначныя вакзалы былі напоўнены імі-ж. Дэлегацыі конгрэсу моладзі з Саксоніі і Турынгіі арыштаваны. Арыштаваны таксама прадстаўнікі на конгрэс Гамбурскага саюзу с-д моладзі.

Гамбург

Ня гледзячы на тое, што ў Гамбургу былі забаронены ўсе дэмонстрацыі, яшчэ да абвяшчэньня апошняе „абавязковае пастановы" Брунінга, у чатырох частках гораду ўжо ў суботу адбыліся дэмонстрацыі. У дэмонстрацыях прымала ўдзел больш 2000 рабочых. Комсамольцы у сваіх выступленьнях заклікалі рэволюцыйных рабочых Гамбургу дэманстраваць 5 і 6 красавіка супроць фашысцкай дыктатуры. У цэнтры гораду дэмонстравала 500 рабочых. 20 хвілін гарадзкі цэнтр быў пад уплывам дэмонструючых калён. У самым ажыўлёным цэнтры выступіў комсамольскі прамоўца. У Бармбэку, у цэнтры барыкадных баёў 1923 году, па сыгналу (сьвісту) стварылася дэмонстрацыя з 600 чалавек. У адной частцы гораду пяць паліцэйскіх накінуліся на дэмонстрантаў. Але рабочая моладзь не ўцякла. Таму 4 паліцэйскія палічылі за лепшае ўцячы а 5-ы быў паранены абуранымі рабочымі.

Сотні маладых рабочых арыштаваны.

Франкфурт

Франкфурт на-Майне знаходзіцца пераважна пад знакам зьлёту комсамольцаў. На мітынгу ў самай вялікай залі Франкфурту прысутнічала больш 10 тысяч рабочых і рабочай моладзі. Тысячы не змаглі папасьці ў залі. Паліцыя 5 раз імкнулася разагнаць мітынг і заарыштаваць артыстых агітпропгруп, але дзякуючы ініцыятыве і дісцыплінаванасьці гэта ім не ўдавалася.

Усюды адбыліся масавыя арышты

У Вісбадэне заарыштавана ўся мясцовая група комсамолу.

Браўншвэйг

У Браўншвэйгу адбыўся масавы мітынг. Больш 10.000 прысутных. Ударная брыгада ў колькасьці 100 чалавек прыехала з Рура. Можна адзначыць надта добрыя вынікі вярбовачнай кампаніі.

86 комсамольцаў заарыштаваны.

Заходняя Прусія—Інстэрбург

Дэмонстрацыя ў апошні час забаронена. Па ўсёй заходняй Прусіі масавая мобілізацыя працоўных. У Кенігсбэргу, Эльбінгу і ў іншых буйных гарадох масавыя сходы даволі добра наведваліся. Два грузавікі з Данцыгу былі затрыманы на нямецкай мяжы, пасажыры заарыштаваны і накіраваны назад праз мяжу. Шофэры аштрафаваны кожны на 40 марак.

Саксонія

У Вурцэне ў панядзелак стварылася недазволеная дэмонстрацыя з больш чым 400 чалавек, якая 20 хвілін дэмонстравала.

Комсамольцы з Лейпцыгу дэмонстравалі ў Бурцэне і ў Мундэнталі У Пірна дэмонстравалі комсамольцы Дрэздэна, якім удалося стварыць новыя мясцовыя групы ў гэтай вобласьці. Піонэры з Дрэздэна дэмонстравалі ў Обэрляўзіцы. Рабочая моладзь Хэмніца дэмонстравала ў Дэбэльне і ў іншых мясцох Эрцгебірга. Масавыя дэмонстрацыі адбыліся і каля Цьвікаў, Фалькенштэйну і ў іншых гарадох і мясцовасьцях Саксоніі. Усюды дэмонстрацыі насілі баявы анты-фашысцкі характар.

Шосты агульнанямецкі дзень прайшоў пад знакам барацьбы супроць фашызму і супроць соцыял-фашызму!

Комсамол Нямеччыны—на-чаку!

А. Проко, Лейпцыг, 1-ІУ 1931 г.

Лепшых комсамольцаў, ударнікаў — у вайсковыя школы.

Падрыхтоўка чырвоных камандзіраў для РСЧА—адна з баявых і ўдарных задач комсамольскай організацыі.

Тав. Варашылаў у сваей прамове на IX зьезьдзе ЎсеЛКСМ з усёй яскравасьцю падкрэсьліў, што аднэй з галоўных задач комсамола ў галіне ўзмацненьня абароназдольнасьці Краіны саветаў зьяўляецца раней усяго: „укомплектаваньне ўсіх нашых вайсковых школ і ў асаблівасьці школ паветранага і марскога флёту, бронетанкавых і тэхнічных школ, у асноўным з свайго асяродзьдзя“.

Аднак, зьмяшчаемыя ў сёньнешнім нумары матар'ялы сыгналізуюць аб тым, што комплектаваньне школ шэрагам раённых організацый ня выконваецца. Вакол вярбоўкі ў школы не разгорнута дастатковая масавая работа сярод рабочай, батрацка-бядняцкай і колгаснай моладзі.

Да сканчэньня вярбоўкі ў вайсковыя школы засталіся лічаныя тыдні.

Трэба прыкласьці ўсе сілы, каб па-ударнаму скончыць падбор кандыдатур у вайсковыя школы.

Трэба з усёй рашучасьцю ўдарыць па опортуністычнай недааценцы вярбоўкі ў вайсковыя школы.

Ударыць па опортуністычных адносінах да вярбоўкі ў вайсковыя школы

Цэнтральная вярбовачная камісія і АБВШ праверылі ў радзе раёнаў Беларусі стан вярбоўкі ў вайсковыя школы. Выявілася, што, ня гледзячы на рад указаньняў і дэрэктыў вышэйстаячых партыйных і савецкіх органаў, яшчэ да гэтага часу у шэрагу раёнаў і гарадоў не організаваны вярбовачныя камісіі, ні курсы па падрыхтоўцы ў вайсковыя школы.

На 6-ці месячныя курсы пры АБВШ Менская, Гомельская, Бабруйская і Віцебская вярбовачная камісіі яшчэ не прыслалі ніводнага чалавека.

У Магілеве вярбовачная камісія была організавана гарадзкім саветам Асоавіяхэму бяз удзелу Гарадзкога савету і Райвыканкому. У Менскім Гарсавеце працуе вылучаны Гарсаветам старшыня вярбовачнай камісіі. 6 раз склікаў ён прадстаўнікоў ад усіх організацый і, як гэта ні дзіўна, ні на адно з паседжаньняў яны не зьявіліся.

Асобныя работнікі вярбовачных камісіі ня ведаюць колькі завербавана кандыдатаў у вайсковыя школы, колькі з іх рабочых ударнікаў.

Вось конкрэтныя факты опортуністычнай недааценкі набору ў вайсковыя школы. Сэкратар комсамольскага колектыву заводу „Комунар“ заяўляе: „Калі мы вам у школу аддамо рабочых, дык хто-ж будзе выконваць прамфінплян“.

Рабочыя абутковай фабрыкі (Менск) скардзяцца: ні фабком, ні адміністрацыя, ні партячэйка не адпускаюць нас у вайсковую школу. Трэба сказаць, што падобныя заявы і адносіны да вярбоўкі не адзінкавы.

На такіх прадпрыемствах гораду Менску, як „Кастрычнік“, „Комунар“ і іншыя да гэтуль рабочыя ня ведаюць аб умовах паступленьня ў вайсковыя школы, аб тэрмінах набору, аб патрабаваньнях, якія прад'яўляюцца да паступаючых у тыя ці іншыя школы.

Такім чынам, у наяўнасьці—опортуністычныя адносіны, палітычная недааценка вярбоўкі ў вайсковыя школы раду партыйных і комсамольскіх ячэек, профсаюзных і савецкіх органаў; справа вярбоўкі не давядзена да прадпрыемстваў, цэхаў, саўгасаў, колгасаў і вёсак: вакол вярбоўкі ў вайсковыя школы не разгорнута ніякай масавай працы.

Комсамол, які нясе велізарную адказнасьць ня толькі за разгортваньне масавай працы вакол вярбоўкі, але і за вылучэньне з свайго асяродзьдзя лепшых кадраў у вайсковыя школы павінен з максымальнай сілай ліквідаваць прарыў, даючы руйнуючы адпор праваопортуністычнай недааценцы гэтае справы.

К

Сымулянты—за даведкай да ўрача

Комсамольцы Заслаўскага раёну ваенізацыяй не займаюцца. Заслаўская ячэйка організавала ваенны гурток, але комсамольцы яго не наведалі. Некаторыя комсамольцы зьвярталіся нават да ўрача за даведкай аб немагчымасьці займацца вайсковай вучобай. Сакратар комсамольскай ячэйкі, т. Каўрыга, першы не наведвае заняткаў.

Такое-ж самае становішча ў Старасельскай ячэйцы.

У раёне комсамольцаў, членаў Асоавіяхэму толькі 42 проц.

Бюро комсамольскіх ячэек, як і райкомол, нічога не робяць, каб прыцягнуць да тых, якія недаацэньваюць ваенную вучобу.

Брыгада „Ч. З“
А. Кляпок, Барова, Ясакар

Разьвёрстка ня выканана

Горская ячэйка, Горацкага раёну, ніякай работы па вярбоўцы сваіх радоў не праводзіць. Адозва 9-га зьезду УсеЛКСМ аб шэфстве над паветраным флётам у ячэйцы не прапрацавана. Разьвёрстку райкому па пасылцы 3-х чалавек у вайсковыя школы ячэйка не выканала.

Шыла.

На зав. „Варашылава“ правальваецца вайсковая вучоба

Стан вайсковай вучобы на заводзе імя Варашылава нездавальняючы.

Маршруты баявой падрыхтоўкі „Комсомольской правды“, а таксама і рашэньні зьездаў у колектыве зусім слаба прапрацованы. Комсамольскі колектыў заводу, які налічвае каля 330 чалавек, ня ўвесь ахоплены вайсковай вучобай. З 80 комсамольцаў сьлясарна-зборачнага цэху наведваюць Асо-гурток 30 чал.

Старшыня савету Асоавіяхэму, ён-жа ваен'орг парколектыву, тав. Сьмірноў вайсковай справай на заводзе ня кіруе.

На запытаньне брыгады колькі ўцягнута комсамольцаў і рабочых у члены Асоавіяхэму і Аўтодору ніхто з адказных работнікаў комсамольскага колектыву, таксама як і тав. Сьмірноў ня мог адказаць.

Гарком комсамолу зусім не дапамагае ваенізацыі колектыву. Пастанова Гаркому стварыць вучэбныя пункты на буйных прадпрыемствах засталася на паперы.

Гарком комсамолу, на чале з кіраўніком вайсковай справы, ня праверыў як выконваюцца ўказаньні аб вайсковай вучобе.

Гарком яшчэ ня даў заводу указаньняў аб вярбоўцы ў вайсковыя школы.

Як у галіне вярбоўкі ў вайсковыя школы, так і ў вайсковай вучобе існуе опортуністычная стаўка на самацёк.

Ні заўком, ні комсамольскі колектыў ніякай растлумачальнай работы ў гэтым кірунку не правёў. Паступіла толькі 7 заяў аб прыёме ў вайсковыя школы.

Ваенкор „Ч. З.“ Н

Пад пагрозай зрыву

МАГІЛЕЎ. 12 (па тэлефону ад нашага юнкора)—Вярбоўка кандыдатур ў вайсковыя школы ў Магілеўскім раёне праходзіць яўна нездавальняюча. Прадстаўнік РК КСМ ніякага ўдзелу ў рабоце раённай камісіі па вярбоўцы ў вайсковыя школы не прымае. У выніку—на курсах па падрыхтоўцы ў вайсковыя школы, соцыяльны і комсамольскі склад не адпавядае тым дырэктывам, якія былі дадзены. Так, з 48 курсантаў толькі 6 рабочых і 7 комсамольцаў. На курсах займаюцца людзі з асьветай 7 і 9 годкі, замест 4-х і 5-ці годкі.

Райнны камітэт ня прыняў ніякіх захадаў, каб забясьпечыць выкананьне разьвёрсткі ЦК ЛКСМБ па пасылцы у вайсковыя школы.

Рабочая моладзь па-за вайсковымі адзінкамі

Комсамольская організацыя фабрыкі „Комунарка“ аддае зусім мала ўвагі ваенізацыі.

Рашэньні 9-га і 10-га зьездаў комсамолу і маршруты „Комсомольской правды“ ячэйка не абгаварвала. У вайсковых адзінках займаецца толькі каля 50 проц. усіх комсамольцаў. Удзел беспартыйнай рабочай моладзі ў вайсковых адзінках вельмі незначны.

Соцспаборніцтва і ўдарніцтва баявой падрыхтоўцы паміж паасобнымі адзінкамі адсутнічае.

У галіне вярбоўкі ў вайсковыя школы ячэйка таксама нічога ня зрабіла.

Вайскор. „Ч. З. Полятухін

15-IV менская комсамолія ўсупае ў прамполітбой

15-IV—31 г. гарком комсамолу г. Менску праводзіць прамполітбой.

Асноўная мэта прамполітбою—праверыць, як прапрацоўваюцца і рэалізуюцца Менскай комсамольскай організацыяй пастановы апошніх зьездаў і пленумаў партыі і комсамолу.

Прамполітбой павінен з усёй яскравасьцю высьвятліць наколькі комсамольская організацыя Меншчыны і яе паасобныя колектывы сапраўды пераключыліся на выкананьне павышаных задач, якія стаяць перад комсамолам у пэрыод небачанага размаху соцбудаўніцтва.

Прамполітбой павінен выявіць стан політвучобы і яе якасьць у справе аўладаньня марксысцка-ленінскімі ведамі, політэхнізацыі політшкол, сувязі паміж політвучобай і практычнай работай на прадпрыемстве, ахоп комсамольцаў політвыхаваўчай работай.

Прамполітбой павінен быць ня толькі праверкай політпадрыхтаванасьці комсамольцаў, але формай яшчэ больш глыбокага растлумачаньня чарговых задач партыі.

Прамполітбой павінен мобілізаваць увагу ўсёй комсамольскай організацыі на выкананьне пастаноў IX і X-га зьездаў комсамолу аб 100 проц. ахопе рабочай моладзі комсамолам.

З прамполітбою выйдзе пераможцай той комсамольскі колектыў які ня толькі будзе ведаць пастановы апошніх пленумаў партыі і зьездаў ЛКСМ, але дасьць лепшыя ўзоры практычнага ажыцьцяўленьня гэтых пастаноў.

Першы этап прамполітбою—з 1-га па 15-е красавіка—павінен праходзіць ў падрыхтоўцы ячэек да другога этапу, шляхам правядзеньня політ-баёў паміж групамі і цэхячэйкамі і падрыхтоўкі рапартоў аб практычных справах комсамольскай організацыі за час падрыхтоўкі да прамполітбою.

Комсамольскі колектыў вылучае брыгады для праверкі падрыхтаванасьці таго колектыву з якім ён уступае ў прамполітбой.

Другі этап—з 15-IV па 25-IV—прамполітбаі паміж аднароднымі па тыпу вытворчасьці прадпрыемствамі.

Трэці этап—25-IV—агульна-гарадзкі прамполітбой, у якім удзельнічаюць колектывы, што атрымалі лепшыя паказчыкі ў папярэдніх прамполітбаёх.

Комсамол—адказны за набор у вайсковыя школы

Падрыхтоўка кадраў для РСЧА, як падрыхтоўка кадраў для соцыялістычнага будаўніцтва, зьяўляецца на даным этапе выключна адказнай задачай.

А між іншым, даныя з месц паказваюць, што ячэйкі да гэтага часу вакол вярбоўкі ў вайсковыя школы не разгарнулі неабходнай працы, што вярбоўка пастаўлена пад пагрозу зрыву. І не таму, што з боку рабочай, батрацкай, колгаснай моладзі няма цягі і жаданьня пайсьці ў вайсковыя школы, а выключна таму, што партыйныя, комсамольскія і профсаюзныя ячэйкі не давялі важнейшую палітычную кампанію да прадпрыемства, саўгасу і колгасу, не разгарнулі шырокую работу, не ўзьнялі ўвагу грамадзкасьці вакол гэтай адказнай задачы.

Вярбоўка ў вайсковыя школы ў 1931 годзе павінна даць РСЧА пераважна кадры ўдарнікаў з рабоча-батрацкай і колгаснай моладзі. Кожная партячэйка, профсаюзныя і комсамольскія організацыі павінны правесьці вярбоўку ў вайсковыя школы імянна пад лёзунгам: „Дамо вайсковым школам лепшых ударнікаў“.

Асаблівую ўвагу трэба будзе зьвярнуць на тое, каб ні ў якім выпадку не дапусьціць пранікненьня соцыяльна чужога элементу ў вайсковыя школы. Таму на сходах комсамольскіх ячэек, на профсаюзных сходах, на сходах колгасаў, кандыдатуры падаўшых заявы аб паступленьні ў вайсковыя школы неабходна ўсебакова абгаварыць і выказаць сваю думку аб тым, ці іншым кандыдаце. Такім чынам зьявіцца адказнасьць за кандыдата ў вайсковыя школы, якую бярэ на сябе пролетарская грамадзкасьць.

Партыйныя, комсамольскія ячэйкі і профсаюзныя організацыі разам павінны разгарнуць шырокую работу з тым, каб давесьці гэту важнейшую палітычную кампанію да прадпрыемства, цэху у горадзе да саўгасу, колгасу і вёскі. Трэба будзе шырока скарыстаць абедзенныя перапынкі, гутаркі, сходы рабочых для растлумачэньня важнасьці вярбоўкі ў вайсковыя школы. У клюбах, у чырвоных кутках павінна быць організавана справачная работа аб умовах паступленьня у вайсковыя школы.

Трэба скарыстаць на лініі кіно карціны, якія адбіваюць жыцьцё і быт Чырвонай арміі і вайсковых школ. Падшэфныя вайсковыя часткі павінны організаваць экскурсіі і разгарнуць сыстэматычную працу на прадпрыемствах па вярбоўцы ў вайсковыя школы. Раённыя вярбовачныя камісіі, разам з райкомамі комсамолу, шырока разгортваючы працу ў саўгасах, колгасах, а таксама на вёсцы па растлумачэньню як правілаў паступленьня ў вайсковыя школы, гэтак і палітычнага значэньня гэтай кампаніі.

Каб павысіць агульна-адукацыйныя веды кандыдатаў у вайсковыя школы, вайсковыя камісарыяты, вярбовачныя камісіі організуюць сець курсаў.

Курсы на працягу 6 м-цаў павінны запоўніць недахопы ў агульна-адукацыйным узроўні рабочага, батрака, колгасьніка, які паступае ў вайсковую школу.

Вярбовачным камісіям, разам з райкомамі камсамолу, асаблівую ўвагу зьвярнуць на адбор кандыдатаў па давай разьвёрстцы для паступленьня на падрыхтоўчыя цэнтральныя курсы пры Аб'яднанай Беларускай Вайсковай Школе, якія працуюць з 1-га красавіка 1931 году.

На комсамол у бягучым годзе ўскладзена адказная задача па вярбоўцы ў вайсковыя школы. Таму, у рабоце кожнай ячэйкі і ўсяго комсамолу на Беларусі гэта вярбоўка павінна стаць важнейшай палітычнай кампаніяй. І ня толькі ў галіне грамадзкай увагі, але, і галоўным чынам,—і выдзяленьня лепшых з лепшых комсамольцаў—ударнікаў у вайсковыя школы.

Трэба ў бягучым годзе поўнасьцю выканаць ўзятыя на сябе шэфскія абавязкі над Аб'яднанай Беларускай Вайсковай Школай. Гэтая работа павінна быць разгорнута неадкладна і ўвесь час зьяўляцца важнейшай задачаю дня. Нельга далей траціць часу. Такое становішча цярпіма быць ня можа, бо яно зьяўляецца простай палітычнай недааценкай выкананьня задач, пастаўленых партыяй у галіне падрыхтоўкі кадраў для РСЧА.

Конюхаў.

Выраўнаць фронт наступленьня

Кантрактацыя—адсталы вучастак падрыхтоўкі да сяўбы

Разгарнуць масава-палітычную працу,—ушчэнт разьбіць опортуністычную практыку

Зацяжка вясны скарачае да мінімуму тэрміны сяўбы, што ўздымае нашу адказнасьць за дакладную падрыхтоўку Трэба падрыхтавацца так, каб у максымальна кароткі тэрмін скончыць сяўбу.

Тэмпы, якія мы зараз узялі ў падрыхтоўцы, ні у якім разе не забясьпечваюць выкананьня гэтай задачы.

Ня гледзячы на неаднакротныя катэгорычныя дырэктывы партыі і ўраду аб ўзьняцьці тэмпаў колектывізацыі кантрактацыі яравых пасеваў, складаньня насенных фондаў—яны усё яшчэ нездавальняючы.

Хутка пачынаецца сяўба. Комсамольскім ячэйкам трэба па днёх і гадзінах разьлічыць час, які застаўся да сяўбы, каб, сканцэнтраваўшы ўсе сілы і ўвагу на адказьнейшых вучастках, забясьпечыць сапраўды бальшавіцкую падрыхтоўку.

Трэба па-ўдарнаму ўзяцца і выканаць дырэктывы партыі аб 30 проц. колектывізацыі БССР за час пасеўкампаніі. Тэрмінова выканаць пляны стварэньня насенных і фуражных фондаў. У найкарацейшы тэрмін правесьці 100 проц. кантрактацыю яравых пасеваў. Даць ударны разгон пераводу колгасаў на зьдзельшчыну і ліквідаваць абязьлічку у саўгасах і колгасах.

БОЛЬШ АДТЭРМІНОВАК БЫЦЬ НЯ МОЖА

(На нарадзе па кантрактацыі яравых пры ЦК ЛКСМБ)

БССР на апошнім месцы па кантрактацыі яравых. З мэтай высьветліць сапраўдны стан кантрактацыі, прычыны прарыву і меры, патрэбныя для ліквідацыі гэтага прарыву, пры ЦК ЛКСМБ 11-IV—адбылася нарада прадстаўнікоў цэнтральных кантрактуючых організацый.

Рэспубліканскі плян кантрактацыі на 5-IV паказвае наступныя лічбы выкананьня: збожжа 31 проц., лёну—4 проц., траў—26 проц. і сена—3 проц. Пераважны проц. кантрактацыі падае на колгасны сэктар. У індывідуальным сэктары кантрактацыя праходзіць ганебна марудна. Ільнаводныя раёны (Багушэўскі, Боркавіцкі, Петрынскі, Кармянскі, Чырвонапольскі, Лоеўскі) не закантрактавалі ў аднаасобнікаў ніводнага га.

Адозва ЦК і СНК не даведзена да пасеўніка

Асноўная прычына прарыву ў тым, што многія раёны не надалі належнага палітычнага значэньня гэтай найважнейшай палітычна-гаспадарчай кампаніі. Замест таго, каб на аснове адозвы ЦК і СНК разгарнуць растлумачальную і палітычна-масавую работу сярод колгасьнікаў і бядняцка-серадняцкай масы аднаасобнага сялянства, у некаторых раёнах (Аршанскі, Вуліцкі) масавую працу падмянілі адміністраваньнем, формальна-бюрократычным складаньнем умоў па кантрактацыі.

Той факт, што Койданаўскі раён выканаў плян кантрактацыі на 134 проц., Крычаўскі на 170 проц. і інш. раёны выканалі пляны—гаворыць аб тым, што пры бальшавіцкай напружанасьці і разгарнуўшы палітычна-масавую работу, пляны ня толькі выконваюцца, але і перавыконваюцца.

На нарадзе прадстаўнік з Бельльнасаюзу, т. Ягораў, імкнуўся давесьці, што плян кантрактацыі ў аднаасобным сэктары зрываецца дзякуючы об'ектыўным прычынам:

„У аднаасабовым сэктары кантрактацыя слаба ідзе таму, што сяляне большасьцю жывуць на хутарох і іх цяжка склікаць на сход (!?)

Але сапраўднасьць гаворыць аб другім. Бельльнасаюз фактычна не кіраваў гэтай работай, пляны дасланы ў раёны са спазьненьнем на 3-4 тыдні. Ільнасаюз ня ведае аб сапраўдным стане кантрактацыі Ня ведае ці даведзена адозва ЦК і СНК, ільготы і вытворчая дапамога кантрактантам, Ільнасаюз ня ведае аб тым, дзе будуюцца ільназаводы.

Кантрактацыя ў раёнах ня ўвязваецца з задачамі колектывізацыі. На пытаньне колькі організавана колгасаў пры правядзеньні кантрактацыі, прадстаўнікі адказалі: „Лічбы ў НКЗеме, у нас іх няма".

Опортуністыя скарачаюць пляны кантрактацыі

Рад раёнаў замест таго, каб разгарнуць па-баявому кампанію кантрактацыі, заняліся валакітай „гандлем" з цэнтральнымі органамі аб скідцы опортуністыя з Жлобінскага, Смалявіцк. і Сьмілавіцк. райкоопсаюзаў скарацілі дадзенае ім заданьне. Вузьдзенскі і Пухавіцкі



Чырвонаармейцы дапамаглі колгасу адрамантаваць інвэнтар.

райкоопсаюзы ўвесь час прысылалі сваіх прадстаўнікоў у Менск, каб зьнялі з пляны кантрактацыю лёну, бо, бачыце, у іх не расьце лён (?)

На складах райкоопсаюзаў ляжыць завезенае ўгнаеньне, якое рэалізавана толькі на 15 проц.

Асаблівы прарыў у кантрактацыі па лініі Садагародсаюзу. Пляны ў раёны дасланы толькі 25-га сакавіка. У прыгарадных с-саветах Гомелю і Віцебску аніякай работы не праводзіцца. Кіраўніцтва райкоопсаюзаў за опортуністычную бязьдзейнасьць было распушчана, але новае кіраўніцтва ня здолела ўзяць належныя тэмпы. У Гомелі распадаюцца вытворчыя насялковыя таварыствы. Групы беднаты пры іх нідзе ня створаны.

Наркомснаб і Наркомзем фактычна ня кіруюць кампаніяй кантрактацыі. Яны займаюцца толькі апрацоўкай лічбаў і процантаў.

Комсамол таксама да гэтага часу ня ўключыўся па-баявому ў правядзеньне кантрактацыі.

Мобілізавацца на поўнае і сваячасовае выкананьне плянаў

Церахаўскі райкамол не мобілізаваў комсамольцаў на кантрактацыю. Уся комсамольская раённая организацыя стаіць у баку ад гэтага. Цэрахаўскі раён выканаў заданьне на 0,3 проц. за што „Чырвоная Зьмена" занесла гэты райком КСМ, на чале з сэкратарам тав. Дворнікавым. на чорную дошку.

Гомельскі гарком павінен быў пасьлаць 70 комсамольцаў для правядзеньня кантрактацыі, а паслаў толькі 30 чалавек. На вёску выехала толькі 20 чалавек. Таксама ня выканалі заданьня Менскі і Віцебскі гаркомы.

На падставе матар'ялаў нарады, ЦК ЛКСМБ зробіць адпаведныя вынікі для мобілізацыі комсамольскай організацыі на фронт кантрактацыі.

Апошняя адтэрміноўка дадзена партыяй і ўрадам: па збожжу—15 красавіка і па тэхнічных культурах—5-га мая. Плян кантрактацыі павінен быць выкананы па тэрміну і поўнасьцю.

А. Усьмінскі.

КІРАЎНІЦТВА, ЯКОЕ АБАНКРУЦІЛАСЯ


Чэрвеньскі Райколгассаюз ня стаў сапраўдным штабам кіраўніцтва падрыхтоўкаю да другой бальшавіцкай сяўбы. Жывога кіраўніцтва колгасамі няма. Работнікі Райколгассаюзу абмяжоўваюцца рэдкімі выездамі на месцы. Стварэньне насенных фондаў такіх культур як лён, каноплі, віка знаходзіцца пад пагрозай зрыву.

Да апошняга часу не абменена звычайнае насеньне на гатункавае.

Рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтара праходзіць вельмі марудна. Райколгассаюз нават ня ведае аб тым, у якім стане знаходзіцца гэта справа. Фуражныя фонды не броніруюцца, мінэральнае ўгнаеньне ляжыць на складах.

М. Ракіта.

Комсамол—ударная брыгада соцыялізму



Комсамольская брыгада трактарыстых на працы ў выездзе.

АВАНГАРД 3-га РАШАЮЧАГА

Тыя, хто выканаў дырэктыву партыі аб 30 проц. колектывізацыі

НЯМА БОЛЬШ ЗВАРОТУ ДА СТАРОГА

ВУШАЧЫ, 1. Завячэльскі сельсавет у асноўным закончыў суцэльную колектывізацыю і на ее аснове ліквідуе кулацтва як клясу. На першае красавіка сельсавет колектывізаваны на 93 проц. Таксама ідуць да суцэльнае колектывізацыі Мазырскі сельсавет—45 проц. і Ваплаўскі—42 проц.

Як старыя, так і новаорганізаваныя колгасы па-бальшавіцку рыхтуюцца да вясеньняй сяўбы.

Л. Рыхлы.

СТАЛІНСКІ ЗАКЛІК ДАЎ 18 НОВЫХ КОЛГАСАЎ

КРУПКІ, 1. У час сталінскага закліку ў колгасы па Копыскім раёне організавалася 18 новых колгасаў. У старыя колгасы ўступіла 410 гаспадарак. Першым па колектывізацыі ідзе Старасельскі сельсавет, які колектывізаваны на 50,2 проц. Колгасы гэтага с.-с. добра падрыхтаваліся да другой бальшавіцкай вясны.

Юнкораўская брыгада „Ч. З".

З 8 проц.—на 37

Рогачоў.—Колектывізацыя ў Запольскім с.савеце (Рагачоўскі раён) праходзіць з вялікім уздымам. За перыяд падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны організавана 6 новых колгасаў. На 1 IV с-савет колектывізаваны на 37 проц., тады як у лютым было толькі 8 проц.

Большасьць колгасаў гатова да выезду ў поле.

Пляны кантрактацыі выкананы па с-савету на 200 проц. Гэтыя дасягненьні дала ўдарная бальшавіцкая работа партыйнай і комсамольскай ячэек, якія ўсю падрыхтоўку да вясны і кантрактацыю падпарадкавалі галоўнай задачы—колектывізацыі вёскі.

Іваноў.

Узоры бальшавіцкай самаадданай барацьбы

Ячэйка КСМ комуны „Іскра" (Рагачоўскі раён) падрыхтоўку да другой бальшавіцкай вясны і колектывізацыі праводзіць бальшавіцкімі тэмпамі. Праведзена шырокая ростлумачальная і палітмасавая праца ў Кісьцялаўскім с-савеце. За час падрыхтоўкі да вясны організавана 7 новых колгасаў, процант колектывізацыі с-савету ўзьняўся з 4-х да 70. Ідзе далейшая напружаная работа па скančэньню суцэльнай колектывізацыі сельсавету

Уся ячэйка комсамолу абвясьціла сябе ўдарнай брыгадай другой бальшавіцкай вясны. Комуна „Іскра" і астатнія колгасы с-с гатовы выехаць на бальшавіцкі сеў.

Ані.

АРДАЦКІ СЕЛЬСАВЕТ НАПЯРЭДАДНІ СУЦЭЛЬНАЕ КОЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

ШКЛОЎ, У Ардацкім сельсавеце наглядаецца вялікі прыліў у колгасы. У час, распрацоўкі па станоў 6-га зьезду Саветаў організаваліся 4 новыя колгасы. Сельсавет колектывізаваны на 70 проц.

Язэп Гара.

БАЛЬШАВІЦКІМІ ТЭМПАМІ

БАРКОВІЧЫ, Дзякуючы бальшавіцкай рабоце партыйнай і комсамольскай ячэек сярод аднаасобнікаў Замшанскага сельсавету, організаваны 3 новыя колгасы: „Ударнік", „Чырвоная Іскра" і „Молат".

Сельсавет колектывізаваны на 35 проц. З кожным днём фронт колектывізацыі пашыраецца.

З. Барчук.

3 спэцыялізаваныя брыгады на барацьбу за бальшавіцкі сеў

Рогачоўская комсамольская організацыя абвясьціла па раёне веснавую трывогу. Бюро РК выпрацавала месячны плян конкрэтных дзеяньняў па 5-ці маршрутах. Мобілізаваны і пасланы ў сельсавет 85 чалавек гарадзкога комсамольскага актыву. Пасланы ў колгасы 3 спэцыялізаваныя брыгады.

Сэкратар РК—Ждан.

УСІМ РАЙКОМАМ ЛКСМБ

Згодна пастановы Сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ ад 10-IV-31 г., у Горках пры С.-Г. Акадэміі організуюцца і 20-га красавіка г. г. распачнуць працу 2-тыднёвыя курсы па падрыхтоўцы загадчыкаў раённых с.-г. станцый моладзі.

Курсы ставяць сабе мэтай падрыхтаваць кіраўнікоў па рацыяналізацыі, вынаходству і масаваму дасьледваньню ў саўгасах і колгасах:

Усім райкомам комсамолу прапануецца падабраць (па 1 чал. з раёну) для пасылкі на гэтыя курсы

Вызначаныя таварышы павінны зьявіцца ў Горкі 20-IV-г. г. к 8 годз. раніцы.

Курсанты забясьпечваюцца інтэрнатам, харчаваньнем і праездам туды і назад.

Заг. орг.адд. ЦК ЛКСМБ Гейдэ

І песьню Трамаўца варштат адчуе! Адходзь, хто здаў! Мацней наш удар! За нас эпоха галасуе!

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ТРАМАЎСКІ РУХ КІРАЎНІЦТВАМ І МАТАР'ЯЛЬНАЙ БАЗАЙ

Рэзолюцыя Бюро ЦК на пытаньні аб становішчы трамаўскага руху БССР

1. Бюро ЦК адзначае, што трамаўскі рух узрос непасрэдна з гушчаў рабочай моладзі, як праява самадзейнасьці і ўдарніцтва рабочае клясы ў галіне мастацтва. Вялікае значэньне ТРАМ'у у тым, што ён выхаваны рабочай клясай, стаіць на чале самадзейнага мастацтва, зьяўляецца ўжо не толькі „мастацкім агітпропам комсамолу", а ўплывае на мастацтва, у тым ліку і на прафсаюзнае, становіцца адным з ударных атрадаў пролетарыяту у барацьбе за стварэньне соц. мастацтва.

2. Ва ўмовах БССР ТРАМ'аўскі рух мае вялікае значэньне. Пасьпяхова праведзеная ленінская нац. політыка ўключыла ў нац культ. будаўніцтва шырокія колы працоўных і ў першую чаргу рабочых. Існаваньне і разгортваньне трамаўскага руху—гэта абвяржэньне разважаньняў контррэволюцыйных нац-дэмаў, гэта яскравы довад удзелу і кіруючай ролі пролетарыяту ў культурным будаўніцтве БССР, довад будаўніцтва соцыялістычнай па зьместу, нацыянальнай па форме культуры, а не „адраджэньне культуры мінулых часоў".

3. У БССР, пачынаючы з 1929 г. пачаў шырока разгортвацца трамаўскі рух. У Менску існуюць 2 трамы—беларускі і яўрэйскі, у Гомелі—2 трамы і Віцебску трам-ядро. У Менску ёсьць агітпропбрыгады і амаль ва ўсіх гарадох БССР рабочая моладзь высоўвае пытаньне аб організацыі ТРАМ'аў.

Разгортваньне трамаўскага руху ў БССР затрымліваецца тым, што савецкія і профсаюзныя організацыі не аказваюць ТРАМ'ам дапамогі і недаацэньваюць значэньне ТРАМ'аў. Кіраўніцтва комсамольскіх організацый трамаўскім рухам зусім недастатковае. Бюро ЦК асабліва падкрэсьлівае недапушчальныя адносіны Галоўмастацтва і НКАсьветы да падвядзеньня матар'яльнай базы пад трамаўскі рух. На 1931 г. адпушчана 13.000 руб. пры патрэбнасьці ў 100 000 мінімальна. Такое становішча з матар'яльнай базай ставіць пад пагрозу развалу існуючыя трамы і тым самым згортваньне трамаўскага руху наогул.

Старэйшы ў БССР беларускі ТРАМ, ня гледзячы на значную работу праведзеную ім за паўтара гады, за гэты час працуе ў вельмі кепскіх умовах, з заразі само існаваньне яго пастаўлена пад пагрозу зрыву. Ня гледзячы на запатрабаваньні комсамолу, пролетарскай грамадзкасьці і друку аб уключэньні беларускага ТРАМ'у у дзяржаўны каштарыс на 31 г., беларускі ТРАМ ня быў уключаны. Расцэньваючы такія адносіны да трамаўскага руху, як адбітак клясавай барацьбы, якая выражаецца ў праяўленьні контр-рэволюцыйнага нац-дэмоўскага ўплыву у мастацтве, прасіць ЦК КП(б)Б абгаварыць пытаньне аб трамаўскім руху.

4. Улічваючы асаблівую важнасьць узмацненьня трамаўскага руху і далейшае яго разгортваньне, лічыць неабходным ужыць наступныя мерапрыемствы:

а) Для нормальнага развіцьця трамаўскага руху БССР узьняць пытаньне аб водпуску сродкаў на 1931 г. Наркомасьветы (дадаткова) 40.000 р., ЦСПСБ—30.000 руб., Менгарсавет—30.000 руб., СНКБ—15 000 руб. Паставіць пытаньне аб уключэньні ў дзяржаўны каштарыс на 1932 год выдаткаў на разгортваньне трамаўскага руху. Лічыць неабходным прафэсыяналізацыю ў г.г. асноўнага ядра Белтраму (20 чал.) і разгортваньне Белтраму ў пачатку 32 году ў Беларускі Дзяржаўны ТРАМ.

б) Дзеля ажыцьцяўленьня адзінага кіраўніцтва як організацыйнага, так мэтодычнага ТРАМ'амі і трам'ядрамі, стварыць Цэнтральны Савет трамаў у складзе 30 асоб і прэзыдыум з 9 асоб. Пэрсональны склад прэзыдыўму зацьвердзіць: т. т. Рубінчык, Шамшур. Любан, Стэльмах, Лебедзеў, Олігнэр, Дольскі, прадстаўнік ад Менскага Гаркому ЛКСМБ і рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена". На цэнтральны савет ускласьці абавязкі кіраўніцтва ўжо існуючымі трамамі. зацьверджаньне новых трамаў, кіраўніцтва трам'ядрамі і агітпропбрыгадамі, якія знаходзяцца ў комсамольскай сыстэме.

в) Адзначаючы, што трамаўскі рух яшчэ не заняў належнага месца ў пролет. грамадзкасьці тамy, што у рабоце трамаў мае́цца шэраг недахопаў, галоўным з якіх зьяўляюцца: недастатковая сувязь з прадпрыемствамі, некаторая замкнутасьць у сваёй рабоце, слабая політвыхаваўчая работа і інш., неабходна ў бліжэйшы час дабіцца палепшаньня ўнутранага становішча БелТРАМ'у, асаблівую ўвагу зьвярнуць на ўзмацненьне сувязі ТРАМ'у з прадпрыемствамі і рабочай моладзьдзю, на пашырэньне складу ТРАМ'у за лік прыёму новых членаў з комсамольцаў і рабочай моладзі, на пасіленьне політвыхаваўчай работы, зьнішчаючы моманты недысцыплінаванасьці сярод ТРАМаўцаў.

Беларускаму ТРАМ'у ўзяць напрамак на павышэньне інтэнсыўнасьці ў рабоце, дабіваючыся пагалоўнага ахопу ТРАМ'аўцаў ударніцтвам і соцспаборніцтвам, лічыць неабходным як найхутчэй выдаць драматургічныя творы ТРАМаў.

г) Прапанаваць усім Гаркомам і Райкомам, дзе маюцца трамы і трам'ядры, узмацніць кіраўніцтва ТРАМаўскім рухам.

УРЫВАК З „ПЕРШАГА ШТАНДАРУ"

Вы чуеце сьпеў рыштаваньняў,—
У ім наш юнацкі імпэт.
Ён ворагаў нішчыць і раніць,
Ён цэмэнт растучага раньня,
Ён кліча: за працу! за тэмп!

Сірэны перамогі загалосяць,
Засьвецяць новым сонцам рыштаваньні,
Колгасы трактарамі застракочуць...
Да новых перамог,
Праз цяжкае змаганьне
Мы крочым, і крочым, і крочым.

Рабочая моладзь заводаў,
Чыгункі, палеў, пабудоў,—
Формуйце ўдарныя ўзводы,
І ходу, таварышы, ходу!
Штурмуйце упартасьць гадоў.

Сірэны перамогі загалосяць, і г. д.

ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ

13-га красавіка, у клюбе Чыгуначнікаў імя „XIII-й гадавіны" Беларускі ТРАМ пакажа сваю пастаноўку „Першы штандар".

Гэта ўжо ня першая праца БелТРАМ'у. Да гэтага часу БелТРАМ, ня гледзячы на свой дзіцячы ўзрост, правёў шмат і іншай працы, а менавіта: стварыў масавыя сьпевы, скокі, сам напісаў і паставіў „Плёткафон", інсцэніроўку „Слова маюць інтэрвэнты", інсцэніраваны політдаклад, п'есу „Грыўня", шэраг сьпеваў і г. д., з якімі выяжджаў дзесяткі разоў у рабочыя клюбы, заводы, колгасы, на абслугоўваньне бальшавіцкага севу, а таксама на вайсковыя манэўры.

Частка з гэтых твораў надрукавана ў БДВ, частка у часопісах і газэтах, а частка рыхтуецца да друку.

Апошняя праца „Першы штандар" напісана таксама ТРАМ'ам. Гэта ўжо грунтоўная вялікая пастаноўка, у параўнаньні з папярэднімі.

З ростам ТРАМ'аўскага колектыву, з ростам нашага жыцьця вырасьлі патрабаваньні да ТРАМ'у.

ТРАМ рашыў гэтую сваю працу аднавіць, але калі пачаў абнаўляць, то ад старога „Першага штандару" засталіся рожкі ды ножкі. Вышла амаль што новая п'еса.

Гэта пастаноўка БелТРАМ'у мобілізуе рабочую моладзь на змаганьне з клясавым ворагам—опортунізмам і яго прыхвасьнямі, рвачамі, прагульшчыкамі, за бальшавіцкія тэмпы, якія патрэбны соцыялістычнаму будаўніцтву і за рэконструкцыю быту, які быў-бы сапраўдным дапаможнікам соцбудаўніцтва.

ТРАМ сваю п'есу напісаў не ўцішы габінэту, а на аснове таго жывога матар'ялу, з якім трамаўцы самі сустракаліся і сустракаюцца на сваіх заводах і фабрыках. П'есу паставіў ТРАМ кіраўніцтвам мастацкага кіраўніка т. Дольскага.

Музыка да п'есы напісана маладым ТРАМ'аўскім композытарам Івановым гэта музыка ня толькі суправаджае пастаноўкі, але зьяўляецца органічным элементам яе.

Афармленьне зроблена ізоядрам ТРАМ'у пад кіраўніцтвам мастака Ахрэмчыка.

Апрача гэтай працы, ТРАМ за гэты час організаваў агітпропбрыгады на чыгунцы, хлебазаводзе, куды вылучыў для кіраўніцтва лепшых сваіх трамаўцаў.

Але, ня гледзячы на дасягненьні якія зрабіў і робіць ТРАМ'аўскі рух на Беларусі, ня гледзячы на тыя задачы, якія стаяць перад ТРАМ'ам—мастацкім агітпропам комсамолу, ТРАМ яшчэ нават да гэтага часу опортуністычна недаацэньваецца НКАсьветы, ЦСПСБ, Гарсаветам.

ТРАМ'ы да гэтага часу працуюць бяз сродкаў без памяшканьня і ўвагі, жывуць толькі падачкамі.

Рабочая моладзь павінна рашуча паставіць пытаньне перад організацыямі аб сапраўднай дапамозе ТРАМ'у прымусіць адпаведныя організацыі ад абяцанак і прыгожых слоў перайсьці да справы,—выканаць пастанову бюро ЦК ЛКСМБ аб ТРАМ'аўскім руху БССР.

У. Стэльмах

Мы крочым, і крочым, і крочым...

1. Трохі гісторыі

Быў пры клюбе „КІМ" драмгурток быў балетны гурток. Прышоў ад ЦК ЛКСМБ Патрусь Шамшур і сказаў: „Організуем ТРАМ".

Што гэта такое ніхто дакладна ня ведаў, Ня-то тэатр, ня-то маладзёжны ня-то „та-ра-рам". Наогул спадабалася. З'організаваліся.

Было гэта ў кастрычніку 1929 г.

Зараз аглядаючыся на гісторыю ТРАМ'у, бачым. што адсутнасьць прынцыповай устаноўкі. тэорэтычнай глебы на доўгі час затрымалі рост ТРАМу.

У ТРАМ з самага пачатку зьбіраліся не „маладыя людзі-аматары мастацтва, якія мараць пра сцэну, а здаро ы комсамольскі маладняк, які ўсур'ёз хацеў працаваць над стварэньнем комсамольскага пролетарскага мастацтва.

Люты 1930 г. ТРАМ атрымоўвае баявое заданьне—выехаць ў колгасы на першую бальшавіцкую вясну. Гэты экзамен паставіў на ногі ТРАМ. У самых глухіх раёнах у надзвычайна цяжкіх умовах, пад кулацкімі пагрозамі ТРАМ рабіў сваю справу: агітаваў за колгасы, выкрываў кулакоў і падкулачнікаў, організоўваў комсамольскія ячэйкі, дапамагаў маладым колгасам організавацца, праводзіў вечары, выступленьні.

З вёскі вярнуліся зьлітаваным колектывам. У першы раз сур'ёзна глянулі самі сабе ў твар. І само жыцьцё патрабавала большай працы. Тады у 2 м-цы вырас першы вялікі ТРАМаўскі спэктакль.—„Першы Штандар". Напісаны, пастаўлены, і аформлены самімі,—не драматургамі, не рэжысэрамі і не мастакамі,—гэты спэктакль ня гледзячы на шмат недахопаў, з радасьцю спаткала рабочая моладзь.

ТРАМ знайшоў глебу над нагамі. Але гэтую глебу хацелі выбіць бюрократычнымі адносінамі органы, ад якіх „наш лёс залежаў", Адсутнасьць сродкаў, дапамогі. кіраўніцтва, ўвагі, амаль „падпольнае" становішча,—абумовілі крызісны стан ТРАМу.

Шмат хлопцаў вышлі з ТРАМу.

Толькі ў апошні час ТРАМ цьвёрда стаў на ногі і ўзяў рашучы курс на змаганьне за свае перадавыя позыцыі ў пролетарскім мастацтве.

2. Дэталі працы

Шум, крык, лямант, сьмех, жарты, чачотка, сьмех, сальты, скокі. Вольты задору, здароўя, жыцьцярадасьці. Але,—сыгнал, і паток пацёк па суровай форме берагоў, круцячы жарнавы працы.

Вырастае ўдарная брыгада комсамолу на фронце мастацтва.

* * *

Люты 30 году. Вялікае сяло (Заслаўскі раён). Наш хлопец пяе частушкі пра мясцовых падкулачнікаў:

Матылевіч ў сяле ёсьць
У міліцыі часты госьць
П'е і вельмі часта б'ецца
Падкулачнікам завецца.

Восень 30 году. Манэўры Чырвонай арміі.

Рыхтуемся тэрмінова да X-га зьезду ЛКСМБ. Дзьве ночы хлопцы ня сьпяць—устанаўліваюць конструкцыю робяць монтаж.

3. Што да адносін...

Мы ўпэўнены, што бяспрытульнасьць ТРАМ'у раней—вынік зусім яснай політыкі былога нацдэмаўскага кіраўніцтва НКАсьветы, Галоўмастацтва. Ім, бязумоўна, неспадабаўся ТРАМ—„лёгкая кавалерыя" у мастацтве. Мы ня раз давялі сваю нецярпімасьць да варожых нот у мастацтве. Мы, напрыклад, прымусілі ўскалыхнуцца усю грамадзкасьць, зьняць „Пінскую мадонну", а потым увесь рэпэртуар тэатру „Галубка". Ці ня ў гэтым сэкрэт зашчамленьня ТРАМ'у—раней?

ТРАМ да гэтага часу ня ўключаны СНК у дзяржаўны бюджэт.

Комсамольскія ячэйкі да гэтага часу недапушчальна адносяцца да свайго агітпропа. Чаго варта выступленьне сэкратара колектыву на нашым „вечары песьні" з заявай, што „на ТРАМ дарэмна трацяцца грошы"?! ТРАМ'аўцаў нагружаюць на ячэйках, лічачы працу ў ТРАМ'е ледзь ня культайствам.

Добра, што ТРАМ'аўцы на гэта не зважаюць, разумеючы важнасьць працы ў ТРАМ'е і сьлепату паасобных комсамольскіх зьвеньняў. Але-ж ці так павінны нам дапамагаць комсамольскія ячэйкі? Просім прабачэньня,—дапамагаюць. Колектыў „Комунара"—наш шэф... Карыстаемся выпадкам, каб напомніць аб гэтым... „комунараўцам", бо яны пэўна-ж забыліся, што мелі „шчасьце" надпісаць такое папяровае абавязацельства..

Тое-ж і да іншых організацый. „Чырвоная Зьмена" калісьці дала нам шмат „падшэфных" сябраў драмгрупы. Яны прыходзілі на „чашку чаю". Але нічым абсолютна не дапамаглі нам у працы.

Ну, а БелАПП, увы! На ўсе спробы ТРАМ'у зблізіцца з БелАПП'ам, той адказваў фанабэрыстай зьнявагай.

Да самага апошняга часу ТРАМ зусім ня меў мастацкага кіраўніцтва. І зараз кіруючых кадраў у ТРАМ'е не стае.

Над гэтымі фактамі варта прызадумацца комсамольскім організацыям.

4. Растуць кадры

Кожны ТРАМавец значна вырас у ТРАМ'е. Прыходзілі культурна і політычна няпісьменныя. І ў ТРАМ'е перавыхоўваліся ў культурных, політычна-адукаваных, клясава-накірованых комунараў.

Усе, хто шлі ў ТРАМ беспартыйнымі, цяпер комсамольцы. Бязупынна расьце наш культмастацкі вопыт.

У нас вылучыліся рэжысэрская група монтажн я і літ-драматургічная. Сябры апошняй уваходзяць у асоцыяцыю дрампісьменьнікаў (наша ўступленьне туды было адказам на выкрыцьцё контр-рэволюцыйных нацдэмаў у асоцыяцыі). Драмгрупа шмат зрабіла: напісала дзьве п'есы, шмат інсцэніровак, сьпеваў і інш.

Трэба, нарэшце, каб БелАПП „празрел" нашу драмгрупу.

5. Да новых перамог

Мы выходзім на авансцэну мастацтва—змагацца за гегемонію пролетарскага мастацтва.

Бязумоўна, у гэтай пастаноўцы будзе шмат недахопаў. Але мы ведаем, што гэта пачатак, што сур'ёзна і правільна працаваць мы толькі нядаўна пачалі, што ў далейшым будуць значна большыя дасягненьні і перамогі.

Наш ТРАМ кіруе самадзейным рухам. Організуем агітпропбрыгады на прадпрыемствах, непасрэдна імі кіруем. Пры лепшых умовах працы зрабілі-б пэўна больш. Мы маем права патрабаваць: не гаварэце нам, таварышы, урачыстых слоў на юбілеях, давайце ўсур'ёз паставім і вырашым пытаньне аб ТРАМ'аўскім і самадзейным руху на Беларусі.

Ёсьць ужо чатыры ТРАМ'ы, вялікая колькасьць агітпропбрыгад. Час ужо організацыйна і юрыдычна аформіць іх, уключыць ТРАМы ў дзяржаўны бюджэт, вылучыць кіраўнікоў, забясьпечыць памяшканьнем, выпушчаць часопіс, павярнуцца тварам усім адпаведным організацыям, прэсе і г. д. да самадзейнага ТРАМ'аўскага мастацтва.

Наш цяперашні спэктакль—гэта „сьпеў рыштаваньняў".

Мы можам сказаць словамі нашага маршу:

Да новых перамог,
Праз цяжкае змаганьне,
Мы крочым і крочым
І крочым!

Есакоў, Юдалевіч.

Паведамленьні

14-га красавіка 1931 г., а 7-ай гадз. увеч. у клюбе 13-ці годзьдзя Кастрычнікавай Рэвалюцыі (б. чыгуначая царква, рог Савецкай і Маскоўскай).

Культпроп Менгаркому ЛКСМБ організоўвае дыспут па пастаноўцы яўрэйскага ТРАМ'у „Франты"—пасьля дыспуту пастаноўка Беларускага ТРАМ'у.

Білеты ў Менгаркоме ЛКСМБ.

* * *

Урачысты пленум 14-IV—31 г. пераносіцца.

Культпроп Менгаркому ЛКСМБ.

* * *

13-га красавіка, а 6-й гадз. увеч. у Гаркоме ЛКСМБ адбудзецца нарада па пытаньню інтэрнацыянальнай працы комсамольскай організацыі.

На нараду павінны зьявіцца працаўнікі па інтэрнацыянальнай працы.

Культпроп Менгаркому ЛКСМБ
Фрумкіна.

13-га красавіка, а 6-й гадз. увеч., у памяшканьні Менгаркому ЛКСМБ адбудзецца пасяджэньне прыймовай камісіі Гаркому.

Яўка сяброў камісіі абавязкова.

На камісію выклікаюцца ўсе таварышы, зацьверджаныя яч. і колектывамі ў кандыдаты ЛКСМБ.

Старшыня прыймовай камісіі
Шымко.

Конфэрэнцыя школьных ячэек МОПР'у і ЮПМ

15-га красавіка г. г., у клюбе Гарсавету (Пляц Волі) адбудзецца конфэрэнцыя школьных ячэек МОПР'у і Юных Прыхільнікаў МОПР'у.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Даклад аб становішчы і задачах школьных ячэек МОПР і ЮПМ;
2. Рапарты ячэек Юных Прыхільнікаў МОПР;
3. Аб падрыхтоўцы да Міжнароднага Дзіцячага Тыдню;
4. Мастацкая частка.

Мандаты выдаюцца штодзённа ў Мен. Гаркоме МОПР (Савецкая, 87).

У тых ячэйках, дзе яшчэ не абраны дэлегаты, абраць іх на агульных сходах.

Юнсэктар пры ЦК МОПР БССР, Менгаркому МОПР і Менгарбюро ДКО.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.
Галоўлітбел № 599

Друкарня імя тав. Сталіна